**І. Я. Кавалёва**

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт*
*Мінск, Рэспубліка Беларусь*
*e-mail: inru@rambler.ru*

# ІДЭНТЫФІКАЦЫЯ СКЛАДАНЫХ СЛОЎ ТЫПУ «АСНОВА+СЛОВА»

У артыкуле разглядаецца словаўтваральны тып складаных слоў «аснова+слова», вылучаны на падставе структурна-марфалагічнага статусу кампанентаў. Устанаўліваюцца крытэрыі аднесенасці кампазітаў да данага тыпу, даецца іх кароткая характарыстыка і прыводзяцца адпаведныя прыклады з твораў беларускай мастацкай літаратуры.

*Ключавыя словы*: складанае слова; кампанент складанага слова; словаўтваральны тып; аснова; слова; прадметна-лагічныя сувязі.

**И. Е. Ковалёва**

*Белорусский государственный университет*
*Минск, Республика Беларусь*
*e-mail: inru@rambler.ru*

# ИДЕНТИФИКАЦИЯ СЛОЖНЫХ СЛОВ ТИПА «ОСНОВА+СЛОВО»

В статье рассматривается словообразовательный тип сложных слов «основа+слово», выделенный на основе структурно-морфологического статуса компонентов. Устанавливаются критерии отнесения композитов к данному типу, дается их краткая характеристика и приводятся соответствующие примеры из произведений белорусской художественной литературы.

*Ключевые слова:* сложное слово; компонент сложного слова; словообразовательный тип; основа; слово; предметно-логические связи.

**I. Y. Kovalyova**

*Belarusian State University*
*Minsk, Republic of Belarus*
*e-mail: inru@rambler.ru*

# IDENTIFICATION OF COMPOUND WORDS OF THE «BASE+WORD» TYPE

The article focuses on the word-formation type which results in «base + word» compounds which are identified on the grounds of the structural and morphological status of their elements. The criteria for labelling compounds as the «base + word» type are determined, as

well as their short description with proper examples from the texts of Belarusian fiction are provided.

*Key words:* compound word; element of a compound word; word-formation type; base; word; subject and logical relations.

Разнастайнасць тыпаў складаных слоў (кампазітаў), іх фанетычныя, марфалагічныя, сінтаксічныя, структурна-семантычныя і лінгвастылістычныя асаблівасці сведчаць аб складанасці гэтага феномена і наяўнасці розных канцэпцый успрымання кампазіта. Таму, нягледзячы на шматлікія даследаванні розных аспектаў складаных слоў у лінгвістыцы на працягу многіх дзесяцігоддзяў, некаторыя праблемы застаюцца не разгледжанымі ў неабходнай ступені.

Аналіз навуковай літаратуры паказаў, што ў беларускай лінгвістыцы адсутнічае ўніфікаваны падыход да ідэнтыфікацыі складанага слова. Пры вырашэнні пытання ідэнтыфікацыі складанага слова ў сучасным мовазнаўстве даследчыкамі выкарыстоўваюцца розныя падыходы: фармальны, семантычны, функцыянальны.

Пры фармальным падыходзе пад складаным словам разумеецца адзінка, утвораная шляхам аснова- і словаскладання, г. зн. марфалагічнага аб’яднання двух і больш каранёў (асноў) або цэлых слоў *сіні-сіні, цар-звон, агульнанародны, чорна-белы* [1, с. 430; 2, с. 213; 3, с. 515; 4, с. 474–476, 489; 5, с. 515–516; 6, с. 126; 7, с. 97, 112–113]. Згодна такой дэфініцыі спрэчным з’яўляецца статус лексічных адзінак тыпу *байкапісец, вальналюбства, старадаўні і інш.,* якія ўтвараюцца ў выніку словаскладання і афіксацыі або ўтваральнай базай якіх з’яўляецца сам кампазіт, што дае падставы адносіць такія адзінкі да афіксальных дэрыватаў. Трэба адзначыць, што ў шэрагу лінгвістычных даследаванняў і даведачных выданняў складанае слова разглядаецца і як вынік афіксацыі, зрашчэння, зрушэння, а таксама скарачэння і іншых словаўтваральных спосабаў [3, с. 515; 4, с. 474–476, 489; 5, с. 536; 6, с. 126; 7, с. 115].

Для зручнасці аналізу кампазітаў з мэтай выяўлення іх спецыфічных характарыстык у лінгвістыцы прынята вылучаць словаўтваральныя тыпы. Пад словаўтваральным тыпам у лінгвістыцы традыцыйна разумеецца «фармальна-схематычная схема будавання вытворных слоў пэўнай часціны мовы, адцягненая ад іх канкрэтных уласцівасцей» [8, с. 37]. Думаецца, такая трактоўка словаўтваральных тыпаў больш арыентавана на афіксальныя ўтварэнні, што тлумачыцца іх большай распрацоўкай у параўнанні са складаннямі. Як адзначалася раней, складаныя словы могуць быць утвораны не толькі пры дапамозе чыстага складання, але і іншых спосабаў, такіх, як афіксацыя: *старажытнасць, кулямётчык*; канверсія: *аднаногі, правафланговы*; скарачэнне: *артмайстэрня,*

*боепрыпасы*; зрашчэнне: *прайдзісвет, абібок*; рэдуплікацыя: *вось-вось, доўгі-доўгі* і інш.

Паколькі ўтварэнне кампазітаў характарызуецца сваёй спецыфікай, аналіз разнапланавых складанняў як асобнай катэгорыі патрабуе іншага падыходу да вызначэння іх словаўтваральных тыпаў.

Вызначэнне словаўтваральных тыпаў у нашым даследаванні праводзілася паводле прынцыпаў, распрацаваных А. І. Маісеевым, які ў залежнасці ад структурна-марфалагічнага статусу кампанентаў выдзяляе словаскладанне, асноваскладанне і асновасловаскладанне [9, с. 117–118]. У выніку былі вылучаны 3 словаўтваральныя тыпы кампазітаў: 1) кампазіты тыпу **«аснова+аснова»**: *хлебароб, байкапісец, сыраварня* (гл. падрабязней [10]); 2) кампазіты тыпу **«аснова+слова»**: *бензакалонка, глуханямы, агульнанародны*; 3) кампазіты тыпу **«слова+слова»**: *плашч-палатка, белы-белы, цар-звон, сцежкі-дарожкі, агульнавядомы*.

Адной з задач пры правядзенні нашага даследавання з’яўлялася распрацоўка асноўных крытэрыяў аднесенасці складаных слоў, выбраных з твораў беларускай мастацкай літаратуры, да вылучаных словаўтваральных тыпаў. У даным артыкуле прадстаўлены крытэрыі аднесенасці кампазітаў да тыпу **«аснова+слова»** і даецца іх кароткая характарыстыка.

На першы погляд можна меркаваць, што да данага тыпу адносяцца кампазіты, першы кампанент якіх уяўляе сабой аснову, а другі – самастойнае слова. Аднак пры вызначэнні структурнага статусу ўтваральнай базы ўзнікаюць пэўныя цяжкасці, паколькі ў некаторых выпадках другі складаючы кампанент можа ідэнтыфікавацца і як слова, і як аснова. Так, параўнаем складанні *азёрна-рыбалавецкі* і *агульна-вясковы*. Другі кампанент кампазіта *азёрна-рыбалавецкі* можна, з аднаго боку, разглядаць як слова-прыметнік *рабалавецкі*, з другога боку, кампанент *рабалавецкі* можа разглядацца як аснова назоўніка *рыбалоўства*. Паколькі *рабалавецкі* можа ўжывацца як самастойнае слова і гэта не супярэчыць прадметна-лагічным адносінам у аб’ектыўнай рэчаіснасці, аналагічныя адзінкі мы разглядаем як слова. У знешне сходным кампазіце *агульна-вясковы*, можна, на першы погляд, меркаваць, што кампанент *вясковы* ўжываецца самастойна і, больш таго, зафіксаваны ў слоўніку. Аднак пры аналізе прадметна-лагічных узаемаадносін паміж кампанентамі і апеляцыі да адносін паміж абазначаемымі дэнататамі ў аб’ектыўнай рэчаіснасці выяўляецца, што *вясковы* – аснова назоўніка, паколькі базай утварэння складання служыць спалучэнне *агульны для вёскі*, а не *агульны, вясковы*. Таксама параўн.: *агульнавядомы* (аснова+слова) < *агульны, вядомы; агульнанародны* (аснова+аснова) < *агульны для народа* і да т. п.

Таму, пры вызначэнні структурна-марфалагічнага статусу другога складаючага кампанента здаецца мэтазгодным улічваць прадметна-лагічныя адносіны паміж прадметамі, дзеяннямі, якасцямі ў аб’ектыўнай рэчаіснасці, якія абазначаюцца кампанентамі складання. Такім чынам, асноўным крытэрыем аднесенасці складаных слоў да тыпу «аснова+слова» з’яўляецца, па-першае, суаднесенасць другога кампанента з самастойна ўжываемым словам, як правіла, зафіксаваным у слоўніку. Па-другое, у якасці крытэрыя выступае ўлік прадметна-лагічных узаемаадносін паміж дэнататамі, якія абазначаюцца кампанентамі складанняў.

Аналіз фактычнага матэрыялу дае падставы сцвярджаць, што вызначаным крытэрыям адпавядаюць наступныя кампазіты.

1) Кампазіты-назоўнікі з другім кампанентам – аддзеяслоўным назоўнікам: *вадасховішча, водападзел, гукапрыёмнік, дзетазабойца, жывёлагадоўля, землеўпарадкаванне, кнігадрукаванне, лесагандляр, літаратуразнаўца, паркабудаўніцтва, пустабрэх, радыёпрыёмнік, самавыкрыццё, светапогляд, хлебанарыхтоўка*. Як вядома, дзеяслоў з удзелам шырокага спектра афіксальных сродкаў з’яўляецца асновай утварэння многіх назоўнікаў [11, с. 172–177].

2) Кампазіты-назоўнікі, утвораныя на базе атрыбутыўных або прыназоўнікавых словазлучэнняў, у якіх галоўнае слова застаецца нязменным *Бела<u>вежа</u> < белая <u>вежа</u>, бенза<u>цыстэрна</u> < <u>цыстэрна</u> для бензіну, перша<u>аснова</u> < першая <u>аснова</u>* і інш.

3) Складаныя прыметнікі, у тым ліку і субстантываваныя, апошні кампанент якіх уяўляе сабой прыметнік або дзеепрыметнік. Такія лексічныя адзінкі адносяцца намі да тыпу «аснова+слова» з той прычыны, што, па-першае, дзеепрыметнікі ўяўляюць сабой базу для ўтварэння прыметнікаў [11, с. 230]. Як адзначаецца аўтарамі «Кароткай граматыкі беларускай мовы», у дзеепрыметніку «лягчэй выдзяляюцца прыметнікавыя прыкметы, чым дзеяслоўныя» [11, с. 232]. Па-другое, не парушаюцца прадметна-лагічныя сувязі паміж абазначаемымі імі дэнататамі ў аб’ектыўнай рэчаіснасці. У сувязі з гэтым дзеепрыметнік становіцца прыметнікам кантэкстуальна. Адметнасць дзеепрыметнікаў падкрэсліваецца і беларускімі лінгвістамі Б. А. Плотнікавым і Л. А. Антанюк, якія пішуць: «Азначальная функцыя дзеепрыметнікаў спрыяла іх пераходу ў прыметнікі, калі на першы план выступае не працэсуальная прыкмета, а якасная (асабліва пры метафарычным ужыванні) з суфіксамі -л-, -н-, -ан-, -ен-, -т-» [12, с. 229]. Такім чынам, суадносныя кампаненты адносяцца намі да слова, параўн.: *абвострана-чуйны, бадзёра-ваяўнічы, важна-маўклівы, глуханямы,*

*галоўнакамандуючы, ваеннапалонны, бесклапотна-жартаўлівае* (субстантываваны прыметнік) і інш.

4) Складаныя прыметнікі, кампанентамі якіх з'яўляюцца адносныя прыметнікі. Другі кампанент ідэнтыфікуецца як слова і кваліфікуецца як прыметнік пры вызначэнні словаўтваральнай мадэлі, нягледзячы на асацыяванне з назоўнікам, з той прычыны, што многія прыметнікі «маюць вытворную аснову» [11, с. 238]: *азотна-тукавы, беларуска-літоўскі, гістарычна-казачны, грачнёва-кукурузны, зіхотка-срэбны, ляніва-сонечны* і інш.

5) Складаныя прыметнікі з апошнім кампанентам – якасным прыметнікам, сярод якіх вылучаецца шмат колераабазначэнняў: *марозна-чысты, масліста-чорны, медна-чырвоны, мляўка-салодкі, неабдымна-прыгожы, падманліва-родны, пафасна-трагічны, празрыста-зялёны, светла-блакітны, светла-русы, сіне-зялёны, сурова-ласкавы, фіялетава-ліловы, цёмна-ржавы, цёмна-шэры, цёпла-чырвоны, чорна-руды, шэра-блакітны, ярка-чырвоны.*

7) Кампазіты, першы кампанент якіх можа ўяўляць сабой скарочаную аснову першага кампанента суадноснага атрыбутыўнага словазлучэння *артмайстэрня, сельгасустанова.*

8) Кампазіты з першай часткай *паў-* і другім кампанентам – словаформай адпаведнай лексічнай адзінкі: *паўбяды, паўдарогі, паўкаравая, паўлусты, паўрубля, паўслова.* Ужыванне другога кампанента ў родным склоне сведчыць аб спецыфічнай уласцівасці беларускай мовы, а гэта, на нашу думку, не супярэчыць суадносінам словаформы са словам.

9) Складаныя прыслоўі з апошнім кампанентам – словаформай назоўніка ў месным склоне *насампраўдзе, насамсправе.*

10) Складаныя дзеясловы з апошнім кампанентам – дзеясловам: *благаславіць, верхаводзіць, зубаскаліць, злоўжываць.*

Марфалагічны аналіз складаных слоў паказаў, што тып «аснова+слова» больш за ўсё распаўсюджаны сярод складаных прыметнікаў, што тлумачыцца ўнутранымі законамі развіцця беларускай мовы. Дзякуючы добра развітай сістэме афіксаў магчыма трансфармаваць адны часціны мовы ў іншыя, напрыклад, назоўнікі і дзеепрыметнікі ў прыметнікі. А таму правамерна лічыць адпаведныя кампаненты складанняў словамі, а не асновамі часцін мовы, якія паслужылі базай для іх утварэння. Другую пазіцыю па колькасці кампазітаў тыпу «аснова+слова» займае назоўнік. Зноў жа, як і сярод прыметнікаў, назіраецца ўплыў моўных законаў на распаўсюджанасць данага структурнага тыпу сярод складаных назоўнікаў. Менш за ўсё структурны тып «аснова+слова» рэалізуецца сярод дзеясловаў і прыслоўяў. Невялікая

колькасць дзеясловаў і прыслоўяў, утвораных па тыпу «аснова+слова» тлумачыцца нетыповасцю данага структурнага тыпу для іх утварэння.

Кампазіты структурнага тыпу «аснова+слова» утвараюцца шляхам складання. У якасці дапаўняльных спосабаў можна вылучыць афіксацыю: *машынабудаванне, лесанарыхтоўка, кровацячэнне;* скарачэнне: *дзетдом, райцэнтр, сельгасустанова, спецперасяленец* і канверсію: *палахліва-самотнае, працаздольны, рознарабочы, самаершы, слабасільны* і інш.

Атрыманыя пры правядзенні даследавання даныя дазваляюць канстатаваць, што словаўтваральны тып «аснова+слова» не з’яўляецца асабліва прадуктыўным у беларускай мове.

## БІБЛІЯГРАФІЧНЫЯ СПАСЫЛКІ


1. Ахманова, О. С. Словарь лингвистических терминов / О. С. Ахманова. – 4-е изд., стер. – М. : URSS : КомКнига, 2007. – 571 с.
2. Беларуская граматыка : у 2-х ч. / АН БССР, Ін-т моваэнаўства; рэд. М. В. Бірыла, П. П. Шуба. – Мінск : Навука і тэхніка, 1985–1986. – Ч. 1. : Фаналогія. Арфаэпія. Марфалогія. Словаўтварэнне. Націск / рэд. М. В. Бірыла, П. П. Шуба. – 1985. – 431 с.
3. Лукашанец, А. А. Словаскладанне / А. А. Лукашанец // Беларуская мова : Энцыклапедыя / пад рэд. А. Я. Міхневіча ; рэдкал. : Б. І. Сачанка (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск, 1994. – С. 515–516.
4. Розенталь, Д. Э. Справочник по русскому языку. Словарь лингвистических терминов / Д. Э. Розенталь, М. А. Теленкова. – М. : ООО «Издательство Оникс» : ООО «Издательство „Мир и Образование“», 2008. – 624 с.
5. Русский язык. Энциклопедия / гл. ред. Ю. Н. Караулов. – 2-е изд., перераб. и доп. – М. : Большая Российская энциклопедия ; Дрофа, 1997. – 703 с.
6. Сцяцко, П. У. Слоўнік лінгвістычных тэрмінаў / П. У. Сцяцко, М. Ф. Гуліцкі, Л. А. Антанюк / пад рэд. М. В. Бірылы, П. У. Сцяцко. – Мінск : Вышэйшая школа, 1990. – 222 с.
7. Шакун, Л. М. Словаўтварэнне : вучэб. дапаможнік для філал. фак. ВНУ / Л. М. Шакун. – Мінск : Выш. шк., 1978. – 128 с.
8. Тихонов, А. Н. Словообразовательный словарь русского языка : более 145 000 слов : в 2 т. / А. Н. Тихонов. – 3-е изд., испр. и доп. – М. : АСТ: Астрель, 2008. – Т. 1. – 860 с.
9. Моисеев, А. И. Основные вопросы словообразования в современном русском литературном языке : учеб. пособие / А. И. Моисеев. – Л. : Изд-во ЛГУ, 1987. – 206 с.
10. Кавалёва, І. Я. Да пытання аб ідэнтыфікацыі складаных слоў тыпу «аснова+аснова» / І. Я. Кавалёва // Иностранные языки : инновации, перспективы исследования и преподавания [Электронный ресурс] : материалы междунар. науч.-практ. конф., Минск, 22–23 марта 2018 г. / БГУ ; редкол.: Е. А. Пригодич [и др.]. – Минск, 2018. – С. 36–38. – Режим доступа: http://elib.bsu.by/handle/123456789/193343. – Дата доступа: 27.06.2018.
11. Кароткая граматыка беларускай мовы. У 2 ч. Ч. 1 : Фаналогія. Марфаналогія. Марфалогія / навук. рэд. А. А. Лукашанец. – Мінск : Беларус. навука, 2007. – 350 с.
12. Плотнікаў Б. А. Беларуская мова. Лінгвістычны кампендыум / Б. А. Плотнікаў, Л. А Антанюк. – Мн. : Інтэрпрэссэрвіс, Кніжны Дом, 2003. – 672 с.